*В. У. Праскаловіч (Мінск)*

# ТЭАРЭТЫЧНАЯ МАДЭЛЬ МЕТАДЫЧНАЙ СІСТЭМЫ КУЛЬТУРАТВОРЧАГА РАЗВІЦЦЯ ВУЧНЯЎ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Самаадданая навукова-педагагічная і метадычная дзейнасць прафесара Ларысы Аляксандраўны Мурынай заслугоўвае таго, каб мы, аддаючы даніну павагі геніяльнаму таленту вучонага, педагога, метадыста, кіраўніка, настаўніка, зноў і зноў звярталіся да яе спадчыны і знаходзілі ў ёй нешта вельмі важнае і патрэбнае для сябе. Нам – вучням прафесара Л. А. Мурынай – выпала адказная грамадзянская і педагагічная місія –працягваць справу Настаўніка, узяць у сэрца, як паходню, яе ідэі.

Канцэптуальныя ідэі прафесара Л. А. Мурынай знайшлі адлюстраванне ў створанай намі тэарэтычнай мадэлі метадычнай сістэмы культуратворчага развіцця вучняў пры выкладанні беларускай літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

У аснову канструявання мадэлі намі пакладзены ўяўленні аб этапах мадэлявання складаных сістэм. Беручы за аснову падобныя па сваёй сутнасці азначэнні (І. В. Блаўберг, Г. М. Валочка, Л. М. Гameза, В. Н. Садоўскі, А. Д. Урсула, Л. А. Худзенка, Э. Г. Юдзін і інш.), мы будзем разглядаць сістэму як упарадкаванае пэўным чынам мноства кампанентаў, якія ўзаемазвязаны паміж сабой і ўтвараюць пэўнае цэласнае адзінства.

З прапанаваных Л. А. Мурынай этапаў мадэлявання метадычнай сістэмы нам удалося ажыццявіць чатыры і пабудаваць тэарэтычную мадэль культуратворчага развіцця вучняў пры выкладанні беларускай літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі [1].

Заўважым, што пабудаваная намі мадэль не прэтэндуе на завершанасць і канчатковы анталагічны статус, мае гіпатэтычны характар.

Тэарэтычная мадэль метадычнай сістэмы культуратворчага развіцця вучняў пры выкладанні беларускай літаратуры адпавядае ўсім неабходным прыметам сістэмнасці і складаецца з чатырох кампанентаў: каштоўнасна-мэтавага, зместавага, працэсуальна-тэхналагічнага, дыягнастычнага.

**І. Каштоўнасна-мэтавы кампанент** уключае мэты, задачы, асноўныя напрамкі культуратворчага развіцця вучняў, культуратворчы падыход, метадычныя прынцыпы яго рэалізацыі.

*Мэты* культуратворчага развіцця вучняў V–XI класаў вызначаюцца на ўзроўнях вучэбнага прадмета "Беларуская літаратура", вучэбна-метадычнага забеспячэння працэсу навучання беларускай літаратуры, адукацыйнага працэсу. На ўзроўні вучэбнага прадмета мэта культуратворчага развіцця вучняў знаходзіць адлюстраванне ў галоўнай мэце навучання беларускай літаратуры, дзе побач з фарміраваннем у вучняў сістэмы літаратурных ведаў, чытацкіх і камунікатыўных уменняў падкрэсліваецца неабходнасць выхавання гарманічна развітай, цэласнай асобы, здольнай самараскрывацца, дастаткова поўна рэалізоўваць сябе ў грамадстве ў працэсе творчай дзейнасці. На ўзроўні рэсурснага складніка (найперш вучэбных, навукова-метадычных, электронных рэсурсаў) мэта фармулюецца наступным чынам: прадстаўленасць у вучэбна-метадычным забеспячэнні інварыянтнага і варыятыўнага кампанентаў зместу літаратурнай адукацыі метадычнай сістэмы сродкаў культуратворчага развіцця вучняў (практыкаванняў, спосабаў і відаў творчай дзейнасці). На ўзроўні адукацыйнага працэсу з улікам канчатковай мэты літаратурнае навучанне ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі ў выніку павінна даць вучням цэласнае ўяўленне пра беларускую літаратуру, яе ідэйна-мастацкае багацце, сфарміраваць сістэму ведаў, уменняў, каштоўнасных арыентацый, вопыт эмацыянальнай і творчай дзейнасці.

Асноўнымі канцэптуальнымі *напрамкамі* культуратворчага развіцця вучняў у працэсе навучання беларускай літаратуры з'яўляюцца:
мастацка-эстэтычны, маўленча-камунікатыўны, напрамак міжкультурнай камунікацыі. Усе пералічаныя метадычныя напрамкі культуратворчага развіцця вучняў у працэсе навучання беларускай літаратуры знаходзяцца ва ўзаемасувязі і арыентаваны ў большай ступені на фарміраванне творча-чытацкіх схільнасцей і асаблівасцей вучняў, на развіццё не толькі адмыслова мастацкіх, літаратурна-крытычных ці даследча-літаратуразнаўчых здольнасцей, але і здольнасцей, якія патрэбны ў самых розных сферах і відах жыццядзейнасці, г. зн. у канчатковым выніку і на фарміраванне высокай духоўнасці і агульнай культуры асобы.

Тэарэтычныя асновы працэсу культуратворчага развіцця вучняў пры навучанні беларускай літаратуры вызначаюцца жанравым, камунікатыўна-дзейнасным і культуратворчым *падыходамі*.

*Прынцыпамі навучання* беларускай літаратуры на аснове культуратворчага падыходу з'яўляюцца: прынцып "пагружэння" ў жанравую прыроду мастацкага твора, прынцып пераемнасці зместу і разнавіднасцей творчай дзейнасці з улікам узроставай сензітыўнасці і

індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцей вучняў і прынцып навучання на аснове ўключэння ў адзіны інтэграваны міждысцыплінарны і міжкультурны працэс ("літаратура – мастацтва – культура").

**II. Зместавы кампанент** культуратворчага развіцця вучняў распрацаваны ў логіцы педагагічных даследаванняў па праблемах сутнасці і структуры зместу адукацыі (І. В. Блаўберг, В. В. Краеўскі, У. А. Ляднёў, інш.) і скарэляваны з мэтай навучання літаратуры. Так, з пункту погляду В. П. Бяспалькі, "увесь змест навучання павінен быць строга падначалены задачы выхавання творцы ў пэўным відзе дзейнасці" [2]. Зместавы кампанент уключае сістэму базавых метапрадметных ведаў і ўменняў, накіраваных на духоўна-маральнае выхаванне вучняў, фарміраванне вопыту мастацка-творчай дзейнасці і эмацыянальна-каштоўнасных адносін, што ў ідэале вядзе да "прырашчэння" культуры асобы. Новы змест навучання беларускай літаратуры і вучэбным відам творчай дзейнасці распрацаваны ў адзінстве інварыянтнага і варыятыўнага кампанентаў зместу адукацыі (уключаючы факультатыўныя заняткі, а таксама электронныя адукацыйныя рэсурсы).

**III. Працэсуальна-тэхналагічны кампанент**

Прапанаваная метадычная сістэма культуратворчага развіцця вучняў уключае ў сябе ўзаемазвязаныя кампаненты, якія ў сувязі са зменай традыцыйнай ведавацэнтрычнай парадыгмы школьнай літаратурнай адукацыі на асобасна арыентаваную, культуратворчую патрабуюць пераасэнсавання не толькі мэты навучання (прыярытэтнасць творчага развіцця асобы вучняў), зместу навучання, прынцыпаў культуратворчага развіцця, формаў арганізацыі навучання, але і тэхналогій, метадаў, прыёмаў.

У сучасных канцэптуальна-праграмных дакументах адзначаецца, што "агульным патрабаваннем для ўсіх метадаў навучання з'яўляецца сарыентаванасць на эстэтычную сутнасць літаратуры, яе мастацкую спецыфіку" [3, с. 12]. Адпаведнасць метадаў навучання задачам развіцця асобы (інтэлектуальнай, культурнай, маральнай, творчай) робіць працэс спасціжэння ведаў яшчэ больш мэтанакіраваным і выніковым. Метады і прыёмы, абумоўленыя спецыфікай культуратворчай скіраванасці навучання беларускай літаратуры, характарызуюцца высокай інтэнсіўнасцю камунікацыі (зносін удзельнікаў сучаснага адукацыйнага працэсу), стварэннем творчага здароўезберагальнага навучальнага асяроддзя, мэтанакіраванай рэфлексіяй вучэбнай дзейнасці.

Сучасны вучэбна-метадычны комплекс па літаратуры найчасцей разглядаецца як сістэма сродкаў навучання, прычым яго прызначанасць

для выкарыстання ў высокатэхналагічным адукацыйным асяроддзі абумоўлівае істотнае ўзрастанне ролі яго электронных кампанентаў.

Згодна з Канцэпцыяй інфарматызацыі сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 года адным з магістральных напрамкаў інфарматызацыі сістэмы адукацыі з'яўляецца стварэнне электронных сродкаў навучання [4]. У святле дадзенай канцэпцыі вырашаецца пытанне пра распрацоўку электронных адукацыйных рэсурсаў па беларускай літаратуры з модульнай арганізацыяй. Канцэптуальныя "ўнутрыпрадметныя" падыходы да адбору і структуравання зместу электронных вучэбна-метадычных комплексаў з модульнай арганізацыяй дэтэрмінуюцца стратэгічнай мэтай літаратурнай адукацыі ў інфармацыйным грамадстве. У найбольш агульным выглядзе яна звязваецца з развіццём асобы вучня шляхам фарміравання літаратурнай, культуратворчай, камунікатыўнай кампетэнцый як асновы для далейшага самаразвіцця і самарэалізацыі. У сувязі з гэтым некаторыя даследчыкі (Г. У. Пальчык і інш.) прапануюць разглядаць электронны вучэбна-метадычны комплекс з модульнай архітэктурай, здольнай забяспечыць "магчымасць інтэграцыі разнастайных навучальных модуляў у ЭВМК як неабходных элементаў фарміравання сучаснага інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя" [5, с. 6], у якасці шматфункцыянальнага электроннага сродку навучання. Па структуры электронны адукацыйны рэсурс па беларускай літаратуры складаецца з некалькіх узаемазвязаных паміж сабой модуляў (даведачна-інфармацыйнага, кантрольна-дыягнастычнага, трэніруючага, інтэрактыўнага) на базе платформы Moodle, кожны з якіх, у сваю чаргу, падзяляецца на блокі-тэмы, якія адпавядаюць раздзелам вучэбнай праграмы па вучэбным прадмеце.

Адметнасцямі электроннага адукацыйнага рэсурсу па беларускай літаратуры з'яўляюцца: варыятыўнае прадстаўленне звестак/інфармацыі, арыентаванасць на полісэнсорную прэзентацыю вучэбных матэрыялаў, іх максімальную "візуалізацыю", на рэалізацыю індывідуальных траекторый навучання, актывізацыю пошукавай і творчай дзейнасці карыстальніка і, адпаведна, высокую ступень дыферэнцыяцыі навучання. Апрача таго, электронны сродак навучання сарыентаваны на мэтавае развіццё творчых (літаратурна-мастацкіх) здольнасцей усіх суб'ектаў адукацыйнага працэсу па літаратуры.

Распрацаваны і ўкаранёны ў школьную практыку электронны адукацыйны рэсурс з выкарыстаннем сістэмы дыстанцыйнага навучання Moodle (*http://e-vedy.adu.by/*), а таксама электронны творчы практыкум з'яўляюцца інавацыйным кампанентам у навучанні беларускай

літаратуры і відам творчай дзейнасці на II – III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі.

**IV. Дыягнастычны кампанент** уключае комплекс аўтарскіх матэрыялаў (анкеты, кантрольна-вымяральныя матэрыялы (на друкаваных носьбітах), камп'ютарныя кантрольна-дыягнастычныя матэрыялы (на лічбавых носьбітах)) і адаптаваных метадаў вывучэння прадуктаў творчай дзейнасці (тэсты крэатыўнасці П. Торанса), прадугледжвае сістэматычнасць, варыятыўнасць і працягласць іх прымянення на ўсіх этапах эксперыментальнай работы, што дазваляе атрымаць аб'ектыўныя якасна-колькасныя вынікі дыягностыкі ўзроўняў культуратворчага развіцця вучняў V – XI класаў установ агульнай сярэдняй адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Наш пункт погляду карэлюе з пазіцыяй В. У. Буткевіч, якая, разглядаючы грамадзянскае развіццё, што ўваходзіць у агульнае развіццё асобы, указвае, што яно (развіццё – *В. П.*) "павінна вывучацца не як якасць да агульнага, а як частка цэлага, бо зрухі ў гэтым развіцці характарызуюцца ў залежнасці ад спосабаў іх выяўлення і вымярэння" [6, с. 39]. Культуратворчае развіццё вучняў намі разглядаецца таксама ў кантэксце агульнага і літаратурнага развіцця асобы.

Ва ўмовах сучаснага сацыякультурнага асяроддзя актуалізуецца праблема дыягностыкі культуратворчага развіцця вучняў, распрацоўкі крытэрыяў ацэнкі адукацыйных прадуктаў літаратурна-творчай дзейнасці. Мы разглядаем ацэнку вынікаў вучэбнай творчай дзейнасці вучняў у прынцыпова новым ракурсе. З гэтай мэтай былі распрацаваны і выкарыстаны *кантрольна-вымяральныя матэрыялы*, якія рэалізуюць культуратворчы падыход да навучання беларускай літаратуры [7]. Змест практыкаванняў і заданняў накіраваны на кантроль і праверку вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па вучэбным прадмеце "Беларуская літаратура", фарміраванне саміх спосабаў творчай дзейнасці, развіццё вобразнага мыслення і ўяўлення вучняў, эмацыянальна-каштоўнасных адносін да твора.

Такім чынам, тэарэтычная мадэль метадычнай сістэмы культуратворчага развіцця вучняў у адзінстве яе каштоўнасна-мэтавага, зместавага, працэсуальна-тэхналагічнага, дыягнастычнага кампанентаў уключае: метадалагічную аснову сістэмы сродкаў культуратворчага развіцця вучняў; метадычную аснову сістэмы сродкаў культуратворчага развіцця вучняў (вучэбна-метадычнае забеспячэнне інварыянтнага і варыятыўнага кампанентаў зместу адукацыі, уключаючы факультатыўныя заняткі, электронныя адукацыйныя рэсурсы);

комплексную методыку культуратворчага развіцця вучняў, прадстаўленую: методыкай навучання відам творчай дзейнасці, суадносным з жанравай дыферэнцыяцыяй літаратуры; інтэграванай методыкай навучання відам маўленча-камунікатыўнай дзейнасці; методыкай навучання ў дыялогу культур; тэхналогіяй модульнага электроннага навучання; дыягнастычны інструментарый: кантрольна-вымяральныя матэрыялы для дыягностыкі ўзроўню культуратворчага развіцця вучняў за перыяд навучання на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі.

Як бачым, прапанаваная намі тэарэтычная мадэль адлюстроўвае ўзаемасувязі асноўных кампанентаў метадычнай сістэмы: мэт, падыходаў, прынцыпаў, зместу, форм, метадаў, сродкаў, выніку.

### *Літаратура*

1. *Мурина, Л. А.* Теоретическое обоснование и разработка онтологических, гносеологических и аксиологических основ развития культуры личности обучающихся в системе непрерывного языкового образования / Л. А. Мурина // Образование и педагогическая наука: тр. Нац. ин-та образования. – Минск, 2007. – Сер. 1: Гуманитарное образование; вып. 1: Концепции и модели. – С. 31 – 44.

2. *Беспалько, В. П.* Образование и обучение с участием компьютеров = Education and learning with computers participation: педагогика третьего тысячелетия : учеб.-метод. пособие / В. П. Беспалько. – М.; Воронеж, 2002.

3. Вучэбная праграма для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання: Беларуская літаратура: V – XI кл. – Мінск, 2012.

4. Концепция информатизации системы образования Республики Беларусь на период до 2020 года // Главный информационно-аналитический центр Министерства образования Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.giac.unibel.by/main.aspx?guid=1383. – Дата доступа: 10.10.2014.

5. Приоритетные направления научных исследований в сфере общего среднего образования в контексте развития информационного общества в Республике Беларусь / Г. В. Пальчик [и др.] // Весн. адукацыі. – 2011. – № 12. – С. 3 – 9.

6. *Буткевич, В. В.* Гражданское воспитание детей и учащейся молодёжи: пособие для рук. учреждений образования, педагогов, кл. рук. и студентов / В. В. Буткевич. – Минск, 2007.

7. *Праскаловіч, В. У.* Беларуская літаратура: зб. творчых заданняў для тэмат. кантролю: 5 –9 кл.: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд.

адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. У. Праскаловіч [і інш.]. – Мінск, 2012.